


# Мы – Захавальнікі ТВП “Сярэдняя Прыпяць”!

## Дзейнічайце разам з намі для захавання прыроды Беларусі!



*Кальцаванне белых буслоў у пойме р. Прыпяць*

Калі Вы жывяце ў межах сярэдняй плыні р. Прыпяць і яе прытокаў ці маеце магчымасць наведваць гэтую тэрыторыю, Вы можаце стаць Захавальнікам ТВП “Сярэдняя Прыпяць” і дапамагчы зберагчы яе для нашчадкаў.

Удзельнічайце ў захаванні ТВП “Сярэдняя Прыпяць”, паведамляйце пра пагрозы і свае назіранні супрацоўнікам АПБ і прыродаахоўных інспекцый.

## Як далучыцца да нас?

**Заходзьце на старонку**

**www.iba.ptushki.org**

**або тэлефануйце:**

**8 (017) 263-06-13**

**ГА “Ахова птушак Бацькаўшчыны”**

8 (017) 263-06-13, www.ptushki.org
8 (029) 223-06-13, info@ptushki.org
8 (029) 101-68-87 www.vk.com.ptushki
www.fb.com/APB.BirdLife.Belarus

**Заказнік “Сярэдняя Прыпяць”**

г. Лунінец
8 (01647) 3-14-00
г. Столін
8 (01655) 2-01-15
в. Пінкавічы, Пінскі раён
8 (01653) 7-96-82

Здымкі: Н. Карліёнава, В. Лукшыц, П. Пінчук, С. Плыткевіч, Т. Раманава, І. Самусенка, Дз. Якубовіч

Праект DCI-NSAPVD/2012/292081 “Прырода важна для ўсіх. Умацаванне аховы прыроды праз развіццё лідэрства і ўдзел мясцовага насельніцтва ў працэсе прыняцця рашэнняў на мясцовым узроўні” рэалізуецца ГА “Ахова птушак Бацькаўшчыны” пры фінансавай падтрымцы Еўрапейскага Саюза. За змест выдання адказвае ГА “Ахова птушак Бацькаўшчыны”

ООО «РИФТУР ПРИНТ» Свидетельство о ГРИИРПИ № 1/284 от 09.04.2014 г. Типография УП «Джи энд Ди» Свидетельство о ГРИИРПИ № 2/36 от 13.01.2014 г. Тираж 2000 экз. Заказ 415

Грамадская арганізацыя
**“Ахова птушак Бацькаўшчыны”**
www.ptushki.org



Тэрыторыя, важная для птушак

# СЯРЭДНЯЯ ПРЫПЯЦЬ

Праект фінансуецца ЕС



*Белакрылыя рыбачкі*

## Што такое ТВП?

Эфектыўным метадам аховы многіх відаў жывёл і раслін з'яўляецца захаванне прыродных тэрыторый, неабходных для іх існавання. Адзін з падыходаў – гэта выдзяленне ў адпаведнасці з пэўнымі крытэрыямі Тэрыторый, важных для птушак (ТВП), якія забяспечваюць выжыванне папуляцый большасці відаў птушак. Гэта месцы гнездавання, зімоўкі ці міграцыйныя шляхі тых відаў птушак, якія маюць неспрыяльны ахоўны статус або знаходзяцца пад пагрозай знікнення.

Сусветная праграма ТВП ахоплівае 200 краін, больш за 12 000 тэрыторый, з якіх 51 знаходзіцца ў Беларусі.

ТВП "Сярэдняя Прыпяць" – гэта буйнейшы ў Еўропе ўчастак рачной поймы, які захаваўся ў адносна натуральным стане. ТВП і аднайменны заказнік працягнуліся на 120 км ад вусця Ясельды да вусця Сцвігі.

**Карта Тэрыторый, важных для птушак Беларусі**




## Цікавыя факты пра ТВП "Сярэдняя Прыпяць"

**1** Гэта апошні ў Еўропе буйны натуральны комплекс нізінных балот, рэк, пратокаў і пойменных лясоў, у тым ліку дубраў, з багатай біяразнастайнасцю, што пацверджана міжнародным статусам Рамсарскай тэрыторыі.

**2** Мае выключнае значэнне як месца гнездавання водна-балотных птушак і іх канцэнтрацыі ў час міграцый. Лідар па колькасці відаў птушак пры наданні статусу ТВП – 44.

**3** Больш чым 1 % еўрапейскіх папуляцый вялікага бугая, качкі-неразні, чорнай і белакрылай рыбачак гняздуецца тут. Занесеныя ў Чырвоную кнігу белая сініца і чорны бусел – даволі пашыраныя тут віды.



*Белая сініца*

**4** Важны рэпрадуктыўны цэнтр для наземнагняздуючых відаў птушак: кнігаўкі, дубальта, куліка-случка, зуйкоў, качкі-чыркі і качкі-лапатаноскі ды інш.



*Птушаняты куліка-случка*



*Звычайная квакша*

**5** Пойма р. Прыпяці – асноўнае месца нерасту многіх рыб Палесся, у тым ліку самоў. Спрыяе пражыванню рэдкіх для нашай краіны балотнай чарапахі, звычайнай квакшы.

## Што пагражае ТВП "Сярэдняя Прыпяць"?

- Веснавое паляванне на водна-балотных птушак у пойме Прыпяці не дае магчымасці мігруючым птушкам назапасіць пажыўныя рэчывы для працяглага пералёту і моцна турбуе віды, якія гняздуюцца на дадзенай тэрыторыі.
- Веснавое выпальванне сухой травы ў пойме знішчае раслiннасць i жывёл.
- Вялікая колькасць адпачываючых, у тым ліку з сабакамі, аматары-рыбаловы – моцны фактар турбавання і адна з прычын гібелі птушанят і кладак.



*Смецце, пакінутае адпачываючымі*

- Інтэнсіўная высечка лясоў, асабліва дрэў з буйнымі гнёздамі і дупламі, а таксама насаджэнняў, дзе распаўсюджаны рэдкія віды раслін і жывёл.
- Драпежніцтва амерыканскай норкі, янотападобнага сабакі, лісіцы, кабана, якія наносяць урон наземнагняздуючым відам птушак.
- Зарастанне пойменных лугоў і балот хмызнякамі з-за спынення сенакашэння і выпасу.



*Традыцыйнае выкарыстанне поймы спрыяе захаванню біяразнастайнасці*